мільёнам рабочых рук. Край бяз вольнага выхаду ў мора ў сваім матэрыяльным і духоўным разьвіцьці будзе заўсёды цягнуцца ззаду за ўсемі, а яркім прыкладам гэткага „вострава на сухапуцьці“ служыць бедная, некультурная, слабая Сэрбія, каторай заўсёды кіравалі чужынцы і каторая счэзла з карты Эўропы як ахвяра самагубнай палітыкі кааліцыі[1].

У межах нямецкай акупацыі пасьля ўпадку Рыгі[2] апынуліся ўсе тыя порты Балтыцкага мора, якія давалі доступ да мора Беларусі. Празь Лібаву, Віндаву і Рыгу йшло за граніцу ўсё, што наш край меў дзеля прадажы на вываз і чаго не сплаўляў па Нёмане. Рыга — гэта перш за ўсё натуральны порт усяго басэйну Дзьвіны, значыць, усей Зямлі Віцебскай і часьці Віленскай, а сыстэма чыгунак зьвязвае зь ей Магілёўшчыну і далёкую Смаленшчыну. Лібава — гэта порт ня толькі для Віленшчыны і Гродзеншчыны, але і для вялізарнага абшару зямлі Мінскай. Гэтак, ваенны фронт зусім адрэзаў ад мора пераважную часьць Беларусі, і калі б мір умацаваў гэты разьдзел нашай Бацькаўшчыны, дык сем мільёнаў беларусаў з таго боку фронту, а також даволі чысьлены элемэнт жыдоўскі і польскі ў Беларусі аказаліся б засуджанымі на вечную эканамічную няволю, на долю Сэрбіі.

Жаданьне ўсіх сьвядомых беларусаў — тое, каб наша Бацькаўшчына не была пабіта на кускі, а каб усе Беларускія землі разам з этнаграфічнай Літвой і ў найцясьнейшай лучнасьці з Курляндзіяй станавілі б суцэльную і вольную дзяржаўную арганізацыю ў зьвязі з тымі дзяржавамі, з каторымі наш край злучаюць жыцьцёвыя інтарэсы.

## „Краёвая Рада Літвы“

Назначэньне Краёвай Рады Літвы ў той момант, калі грамадзянства акупаваных зямель ждала правядзеньня ў жыцьцё парлямэнцкага праекту аб самаўпраўленьні нашага краю[1], вызвала агульнае зьдзіўленьне. І мы пакуль што адзначываем толькі гэту адну праяву адношаньня грамадзянства да памянёнага акту, бо беларусы, не прынімаўшыя ніякага ўчасьця ў падгатоўцы акту, ня мелі магчымасьці высказаць сваіх паглядаў на яго. Мы думаем, што пагляд беларускага грамадзянства на „Краёвую Раду Літвы“ выявіцца ў найбліжэйшым часе, хаця і post factum[2]. Са свайго ж боку лічым патрэбным сказаць вось што.

Да арганізацыі Рады літоўскай групай у Вільню былі прызваны адны толькі літвіны, у дадатку не на моцы выбару насяленьня. З гэтага можна было б зрабіць вывад, што пад „Літвой“ акупацыйныя ўласьці разумеюць толькі этнаграфічную Літву, — значыць, тыя землі, дзе жывуць літвіны, дзе народ гаворыць па–літоўску. Аднак той факт, што Літоўская канфэрэнцыя, выбраўшая кандыдатаў у Раду, засядала ў супольнай сталіцы Беларусі і Літвы, Вільні, навакол каторай жыве беларускае насяленьне, а таксама запаведзь князя Ізэнбурга, што да Рады маюць быць прызваны, між іншым, також і беларусы, ясна паказваюць, што новая ўстанова мае абнімаць справы не літоўскага народу, а ўсяго таго абшару, каторы ўходзіць у склад Militär–Verwaltung[3] Litauen. Вядома ж, што да гэтага складу ўходзіць ня толькі этнаграфічна літоўскі абшар, але і добры кусок Беларусі; гэтак беларускія землі акупацыі аказваюцца штучна разьдзеленымі, і пад той час, як меншая часьць іх аддаецца пад упраўленьне літвінаў, большая астаецца ў межах Verwaltung Biełastok—Hrodna пад упраўленьнем нямецкіх ураднікаў.

Такі разьдзел Беларусі, і без таго разарванай на дзьве часьці ваенным фронтам, вызывае ў нас сур’ёзную трывогу: у межах „маленькай Літвы“ беларусам, перажыўшым часы „пераварачываньня“ ў маскалёў і палякаў, грозіць „пераварачываньне“ ў літвінаў, аб чым кіраўнікі літоўскай палітыкі, засядаючыя цяпер у Радзе, апавесьцілі ўжо ў сваім мэмарыяле для нямецкага канцлера і ў выпушчанай нядаўна кніжцы з „этнаграфічнай“ картай Літвы (P. Klimas. *Lietuva, jos gyventojai ir sienos*. Vilnius, 1917). Беларусы ня могуць спадзявацца пашаны сваіх правоў ад людзей, аб’явіўшых, што „хто каталік — той літвін“, — а гэткім людзям даецца цяпер права ладжаньня і нашага жыцьця.

Інтарэсы беларускага народу ў межах нямецкай акупацыі вымагаюць, каб устанаўленьнем Краёвай Рады Літвы беларусаў не дзялілі, а ўсіх іх злучылі б разам; каб у гэткай радзе — не нацыянальна–літоўскай, а папраўдзе агульнакраёвай — занялі б належнае месца ўсе нацыянальнасьці краю, а ў тым ліку беларусы; каб число прадстаўнікоў ад беларусаў адпавядала б чысьленасьці беларускага насяленьня ў межах акупацыі і каб беларускае грамадзянства атрымала магчымасьць паводлуг сваей думкі і сваей волі выбраць сваіх давераных людзей.

Вось тыя варункі, на каторых беларускае грамадзянства ў занятых немцамі землях можа ждаць забясьпечаньня іх правоў і здаволеньня нацыянальных патрэб пры дачэснай арганізацыі нашага краю. І мы думаем, што толькі на гэткіх варунках яно дасьць веру Краёвай Радзе і прыложыць сваю руку да супольнай з усімі грамадзянамі краю творчай працы.

## Рэзалюцыя беларускага мітынгу 30 верасьня 1917 г.

Сабраўшыеся 30 верасьня 1917 г. у Беларускім Клюбе прадстаўнікі ўсіх кірункаў беларускага грамадзянства сталічнага места Вільні, цьвёрда веручы, што набліжаючыйся мір прынясе незалежнасьць для ўсяго Беларуска–Літоўскага краю, разьдзеленага цяпер на часьці ваенным фронтам, высказываюць сваё жаданьне, каб ужо ў часе вайны правы Беларускага народу ў межах нямецкай акупацыі былі забясьпечаны ў поўнай меры.

У мысьль гэтага сабраўшыеся заяўляюць гарачы пратэст проці падмены рэзалюцыі Глаўнай Камісіі Райхстагу аб самаўпраўленьні зямель акупацыі[1] назначэньнем Краёвай Рады Літвы, каторае нарушае элемэнтарныя асновы народнага прадстаўніцтва і[2] правы Беларускага народу на яго зямлі.

Сабраўшыеся station... 

1. усе беларускія землі акупацыі, разьдзеленыя на два Verwaltung'і: Biełastok–Hrodna і Litauen[3], павінны быць злучаны ў аднэй адміністрацыйнай арганізацыі Літвы;
2. у Краёвай Радзе для ўсіх акупованых Беларуска–Літоўскіх зямель выбарныя прадстаўнікі беларускага грамадзянства павінны мець прапарцыянальнае лічэбнасьці беларусаў з гэтага боку фронту число месц[4].

Урэшце, сабраўшыеся лічаць абсалютна немагчымым для беларускага грамадзянства прыняць учасьце ў Краёвай Радзе Літвы пры яе цяперашняй арганізацыі[5] і даручаюць арганізатарам сходу ўчыніць патрэбныя крокі дзеля сазыву ў Вільні Беларускай Канфэрэнцыі з прадстаўнікоў усіх Беларускіх зямель акупацыі дзеля чыннага ўчасьця ў тымчасовай арганізацыі занятай немцамі часьці нашага Краю на вышэйсказаных асновах.

## Зварот да начальніка адміністрацыі акругі Літва

Выпаўняючы рэзалюцыю беларускага сходу 30 верасьня ў Беларускім клюбе, зложанага з 203 прадстаўнікоў усіх кругоў і ўсіх палітычных кірункаў беларускага грамадзянства места Вільні, мы, ніжэйпадпісаныя члены прэзыдыюма сходу, зьвяртаемся да В[ашай] Сьв[етласьці] з просьбай перадаць у Ob Ost[1] ухвалы беларусаў, высказаныя ў далучанай да гэтага рэзалюцыі.

Цьвёрда веручы, што жаданьня беларускага грамадзянства, каторыя маюць на мэце забасьпячэньне нацыянальных правоў беларусаў у межах акупацыі, будуць прыняты пад увагу найвышэйшай акупацыйнай уласьцю, мы разам з тым просім В[ашу] Сьв[етласьць] перадаць у Ob Ost нашу просьбу аб пазваленьне асобам, каторыя будуць намі дэлегаваны,